## Уступнае слова прэзідэнта Беларускай асацыяцыі палітычных навук У. А. Бабкова

**Паважаныя ўдзельнікі канферэнцыі!**
**Шаноўныя калегі!**

Дазвольце шчыра вітаць вас ад імя Беларускай асацыяцыі палітычных навук і ўсіх іншых арганізатараў канферэнцыі, Міжнароднага адукацыйнага цэнтру, БДЭУ, НАН Беларусі, ад імя аргкамітэту. На нашай канферэнцыі пажадалі выступіць звыш 160 навукоўцаў і палітычных дзеячоў. У рабоце канферэнцыі ўдзельнічаюць кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Мясніковіч Міхаіл Уладзіміравіч, прадстаўнікі выканаўчай і заканадаўчай улады, замежныя госці з Германіі, Польшчы, Індыі. Мы асабліва ўдзячныя ім за цікавасць да беларускіх праблем і жаданне дапамагчы ў іх вырашэнні.

Асноўны касцяк удзельнікаў - беларускія вучоныя - палітолагі, юрысты, філосафы, эканамісты, сацыёлагі, гісторыкі, а таксама лідэры палітычных партый. Многія з іх прыехалі з абластей. Мяркую, гэта вялікі наш плюс, што мы даем трыбуну вучоным з абласных цэнтраў, якім сёння яшчэ болей цяжка, чым нам - ва ўсіх адносінах.

Некалькі слоў пра нашы надзеі на канферэнцыю. Як бачыце, арганізатары стварылі ўсе ўмовы, каб пад гэтым дахам сабраліся навукоўцы, палітыкі самых розных ідэалогій і поглядаў. Таму хацелася б, каб у шчырых, адкрытых дыскусіях мы змаглі аб'ектыўна прааналізаваць рух палітычнага і сацыяльна-эканамічнага працэса ў краіне, вызначыць асноўныя прычыны, што перашкаджаюць яго стабільнаму і эффектыўнаму развіццю, рэкамендаваць уладам шляхі вырашэння праблем, даць прагноз развіцця падзей на бліжэйшую будучыню.

Галоўная мэта канферэнцыі - садзейнічаць выхаду краіны з зацяжнога канфлікта, дапамагчы усталяванню маладой беларускай дзяржаўнасці. Гэтаму будзе падначалена работа і пленарнага паседжання, і секцый.

Аб парадку работы. Усё як у праграме. За выключэннем некаторых дэталяў. Адсутнічаюць два дакладчыкі на пленарным паседжанні. П. Г. Нікіценка знаходзіцца ў санаторыі, а Я. М. Бабосаў - у замежнай камандзіроўцы. Акрамя таго, на пленарным паседжанні выступіць Л. Ф. Яўменаў, член-карэспандэнт НАН

Беларусі па тэме: «Міжнародная ідэалогія правоў чалавека: надзенныя праблемы развіцця».

Перапынкі на адпачынак прапаную рабіць праз дзве гадзіны работы.

Ці ёсць згода? Прымаецца.

Па рэгламенту. Прашу вельмі строга прытрымлівацца вызначанага рэгламента: да 20 хвілін выступленні на пленарным паседжанні, і да 10 - у секцыях. Самі разумееце 163 выступаючых.

Каб скараціць час для адказаў на пытанні, прапаную на пленарным паседжанні задаваць іх у пісьмовай форме, а адказваць напрыканцы пленарнага паседжання.

Згодны? Тады пачынаем творчую работу.